

# Заўсёды з Леніным

**Пятрусь БРОЎКА,** народны паэт Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі, выпускнік БДУ імя У. І. Леніна.

*Сягоння*
*Нас болей і болей,*
*Жыццёвы закон наш —*
*Расці!..*
*І я, і мой сын-камсамолец,*
*І унук, што павінен прыйсці.*

*Нас Ленін,*
*Да шчасця пазваўшы,*
*Вядзе клапатліва ўвесь час.*
*Жывы ён —*
*У партыі нашай,*
*Яна ж неўміручая у нас.*

*Ёсць славы,*
*Што зліты на славу,*
*Іх шмат чалавецтва*
*знайшло,*
*Такога ж магутнага сплаву*
*Дагэтуль яшчэ не было.*
*Працуем —*
*Не знаем спакою,*
*Не ведаем стомы у плячах,*
*Каб стацца хоць кропляй*
*малою*
*Падобнымі на Ільіча.*

*Вяршыні —*
*Прырода стварыла*
*Праз год міліёны сама.*
*Ды велічы гэткай і сілы,*
*Як партыя наша,—няма!*

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

● № 14 (771) ● Панядзелак, 20 красавіка 1970 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

# РУКОЮ ШЧОДРАГА СЕЙБІТА

*А. Н. СЕЎЧАНКА,*
*рэктар, акадэмік АН БССР.*

Не паспелі адгрымець навальніцы Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, як у Савецкай краіне, кіруемай вялікім карыфеем навукі У. І. Леніным, пачалі стварацца новыя вышэйшыя навучальныя установы і буйныя навукова-даследчыя інстытуты. Яшчэ у 1918 годзе У. І. Леніным былі устаноулены і створаны Цэнтральны аэрадынамічны інстытут (ЦАГІ), узначальваемы выдатнымі аэрадынамікамі Н. Е. Жукоускім і С. А. Чаплыгіным, Усесаюзны электратэхнічны інстытут (ВЭІ), кіруемы А. А. Кругам, Фізічны інстытут імя П. Н. Лебедзева, узначальваемы П. П. Лазаравым і шмат іншых.

Хутка стварауся шэраг новых навуковых цэнтрау, якія падпарадкоуваліся Народным Камісарыятам і былі цесна звязаны з патрэбамі народнай гаспадаркі. Навуковыя цэнтры дапамагалі ствараць новыя віды прамысловасці, якія мелі важнае народнагаспадарчае і абароннае значэнне.

Савецкі урад адпускау недасягальныя раней сродкі на навуку і адукацыю. Маленькія дарэвалюцыйныя акадэмічныя лабараторыі сталі хутка якасна і колькасна ператварацца у буйныя навуковыя інстытуты. Навука поунасцю становіцца на службу народу і дзяржаве. Планаванне навуковых даследаванняу звязваецца з дзяржауным гаспадарчым планам.

Яшчэ у 1918 годзе кіраунiцтва Акадэміі навук звярнулася у Савет Народных Камісарау з заніскай, дзе было выказана пажаданне прыняць удзел у даследаваннях карысных выкапняу, энергетыкі, воднай і сельскай гаспадаркі, у эканамічных, картаграфічных і іншых важных работах. Уладзімір Ільіч Ленін саставіу вядомы «Накід плана навукова-тэхнічных работ» для устаноу АН СССР.

Хутка пасля кастрычніцкіх дзён У. І. Ленін атрымау звесткі аб паспяховых вопытах па радыётэлефаніі, якія праводзіліся М. А. Бонч-Бруевічам і яго супрацоунікамі у Ніжагародскай лабараторыі. Адпаведна рашэнню Саунаркома, падпісанага У. І. Леніным, 2 студзеня 1918 года вядомая Ніжагародская радыёлабараторыя абавязана была распрацаваць прыёмна-узмацняльныя лямпы, а у сакавіку 1920 года выйшла рашэнне аб будауніцтве Цэнтральнай радыётэлефоннай станцыі. З гэтага выпадку У. І. Ленін пісау: «Справа гэта гіганцкі важная... Уся Расія будзе слухаць газету, якую чытаюць у Маскве».

У. І. Ленін прыняу усе неабходныя меры для развіцця радыё, і яго прапановы па радыёвяшчанні былі хутка здзейснены. У жніуні 1921 года у Маскве пачала працаваць радыёвяшчальная станцыя, магутнасць якой перавышала магутнасць радыёвяшчальных станцый Нью-Йорка, Парыжа, Берліна, Лондана.

*(Працяг на 3-й стар.).*

# НАС ВІНШУЮЦЬ

Міністэрства горача віншуе калектыў універсітэта з узнагароджаннем Ленінскай юбілейнай Ганаровай граматай за дасягненні па удасканаленню вучэбна-выхаваўчай работы, у развіцці навуковых даследаванняў, падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. Міністэрства жадае калектыву універсітэта далейшых поспехаў у павышэнні якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў — актыўных будаўнікоў камуністычнага грамадства, адданых партыі і народу, у развіцці навукі, тэхнікі і культуры на карысць Савецкай Радзімы.

Міністр ЕЛЮЦІН.

*Сардэчна віншуем калектыў універсітэта з высокай узнагародай— Ленінскай юбілейнай Ганаровай граматай. Жадаем новых творчых поспехаў.*

*Прэзідыум ЦК прафсаюза.*
*Масква.*

**Мінвуз БССР віншуе калектыў Белдзяржуніверсітэта з выпадку узнагароджання Ленінскай юбілейнай Ганаровай граматай ЦК КПСС, Саўміна СССР, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, ВЦСПС. Жадаю калектыву універсітэта новых поспехаў у справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, выхавання будаўнікоў камуністычнага грамадства.**

**Намеснік Мінвуза КРАСОЎСКІ.**

*Ад імя калектыву Мінскага станказавода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі віншуем з дасягнутымі высокімі паказчыкамі ў сацыялістычным спаборніцтве у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна—узнагароджаннем Ленінскай юбілейнай Ганаровай граматай. Жадаем далейшых поспехаў у датэрміновым выкананні прынятых сацыялістычных абавязацельстваў.*

*ЭВЕРСМАН, ВАЛКАНОЎСКІ, БАРХАНАЎ, ЖАЛНЯРУК.*

Мінская кандытарская фабрыка «Камунарка» віншуе калектыў універсітэта з узнагароджаннем Ленінскай юбілейнай Ганаровай граматай, жадае далейшых поспехаў у працы.

**ЗАЙЦАЎ, КУЗНЯЦОЎ, НОВІКАВА.**

Дзяржбуд Беларускай ССР віншуе калектыў з узнагароджаннем Ленінскай юбілейнай Ганаровай граматай за дасягненне высокіх паказчыкаў у сацспаборніцтве у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна і жадае новых вялікіх поспехаў на карысць нашай вялікай Радзімы.

**В. КАРОЛЬ.**

Горача віншуем прафесарска-выкладчыцкі і студэнцкі калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна з высокай ацэнкай вашых поспехаў у навуковай, вучэбнай і выхаваўчай рабоце ў сувязі са 100-годдзем з дня нараджэння У. І. Леніна і узнагароджаннем Ленінскай юбілейнай Ганаровай граматай ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Савета Міністраў СССР і ВЦСПС.

Жадаем вам, дарагія сябры, далейшых поспехаў у справе камуністычнага выхавання моладзі і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў для народнай гаспадаркі.

Сакратар Кастрычніцкага райкома КПБ
Л. ВЯРЖБІЦКІ.



**Усё, што звязана з жыццём і дзейнасцю правадыра працоўных усяго свету, нязменна прыцягвае пільную увагу савецкіх людзей і іх гасцей. З асаблівай цікавасцю яны знаёмяцца з музеямі У. І. Леніна.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнты універсітэта у час наведання філіяла музея У. І. Леніна у Ленінградзе.**

Фота Д. Прэса.

# Ты крочыш разам з намі, жывеш, як жыў, між нас,

## КАМСАМОЛ РАПАРТУЕ ІЛЬІЧУ

Мы многа у сваім жыцці здавалі залікау і экзаменау, але гэты залік — самы галоуны, гавораць студэнты. І гэта сапрауды так. Усесаюзны Ленінскі залік мабілізавау студэнцтва на дастойную сустрэчу юбілею Уладзіміра Ільіча, раскрыу лепшыя якасці вузаускай моладзі, яе гарачыя імкненні зверыць свае справы і учынкі па запаветах правадыра. На камсамольскіх сходах у групах, па патоках, курсах, факультэтах адбылася плённая размова аб ролі і месцы камсамола, аб павышэнні актыунасці і баявітасці, аб фарміраванні светапогляду, аб адносінах да антыграмадскіх і абывацельскіх настрояу.

На фізічным факультэце, напрыклад, быу дэталёва распрацаваны план правядзення заліку, вызначаны яго змест, формы. Абавязацельствы кожнага камсамольца абмяркоувaліся у групах. Асаблівая увага была звернута на тое, каб яны адпавядалі магчымасцям студэнта, стымулявалі яго на напружаную вучобу, павышалі інтарэс да авалодання марксісцка-ленінскай тэорыяй, мабілізавалі на паусядзённую настойлівую працу, усебаковае самаудасканаленне.

Цяпер ужо можна гаварыць аб значных зрухах у справах гэтага факультэта. Павысілася актыунасць студэнтау, палепшылася паспяховасць у зімовую сесію, вырасла колькасць выдатных і добрых адзнак, асабліва па грамадскіх дысцыплінах.

Але асноуны вынік цяжка ацаніць колькасна. Змяніліся самі абставіны у групах, узраслі патрабавальнасць і прынцыповасць, зацікауленасць кожнага у справах таварыша і калектыву у цэлым.

Паспяхова завяршаецца Ленінскі залік на гістарычным, журналістыкі, філалагічным і іншых факультэтах.

Для таго, каб паспяхова вучыцца камунізму, ведаць і свята выконваць ленінскія запаветы, неабходна у першую чаргу глыбока, творча вывучыць бессмяротныя працы Ільіча. Камітэт камсамола і кафедра грамадскіх навук шырока выкарыстоувалі у рабоце са студэнтамі ленінскую тэарэтычную спадчыну. Уздым, з якім студэнты сустракаюць усенародны юбілей, плённа адбіуся на вывучэнні імі грамадскіх дысцыплін. Так, экзамен па марксісцка-ленінскай філасофіі на добра і выдатна здалі 82,2 працэнта студэнтау; па палітэканоміі—78,1 працэнта. Узраслі роля і актыунасць камсамольскіх арганізацый груп у падрыхтоуцы і правядзенні семінарскіх заняткау.

Састауной часткай вучэбнага працэсу стала правядзенне тэарэтычных, навукова-практычных канферэнцый. Амаль на кожным курсе (патоку) прайшлі такія канферэнцыі. Значна ажывілася навукова-даследчая дзейнасць у галіне грамадскіх навук. Кожны трэці студэнт універсітэта падрыхтавау рэферат або навуковы даклад. 498 студэнтау універсітэта прынялі удзел у навукова-тэарэтычнай канферэнцыі па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. Работы гэтыя вызначаюцца шырокай тэматыкай, актуальнасцю, зацікауленасцю да ленінскай тэарэтычнай спадчыны.

Удзельнікі Усесаюзнага конкурсу папоунілі рады студэнцкіх лектарскіх груп, універсітэцкі камсамольскі актыу.

Выраслі і рады студэнцкага навуковага таварыства. Каля 2,5 тысячы студэнтау БДУ актыуна працуюць у навуковых гуртках і лабараторыях. Толькі што закончылася 27-я студэнцкая навуковая канферэнцыя, на якой было заслухана і абмеркавана больш 360 дакладау.

Паспяхова працуе студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя фізічнага факультэта. Тут толькі патрэбна расшырыць кола студэнтау, якія працуюць непасрэдна над выкананнем заказау народнай гаспадаркі.

Ленінскай працоунай вахтай назвалі камсамольцы свой летні семестр 1969 года. Каля трох тысяч нашых студэнтау, аб'яднаных у 80 атрадау, удзельнічалі у будауніцтве 132 аб'ектау, асвоілі 2,5 млн. рублёу капіталаукладанняу. Наш атрад заняу першае месца сярод 56 атрадау краіны, якія працавалі на будауніцтве Волжскага аутамабільнага завода у горадзе Тальяцці. БДУ імя У. І. Леніна узнагароджан Ганаровай граматай Вярхоунага Савета Казахскай ССР за работу студэнцкіх будаунічых атрадау. З кожным годам павялічваецца працоуны уклад студэнтау у будоулі роднай Беларусі. Актыуны удзел прынялі нашы студэнты у ленінскім суботніку.

У год Ленінскага заліку значна падняуся узровень агітацыйна - прапагандысцкай і культурна-масавай работы. На кожным факультэце створаны агітбрыгады, якія рэгулярна выступалі з канцэртамі і лекцыямі у розных кутках Беларусі. Толькі у падшэфныя школы Стаубцоускага раёна 34 разы выязджалі нашы агітбрыгады. Гэтым школам перададзена 10.120 кніг. Студэнты-фізікі папауняюць школьныя кабінеты прыборамі, хімікі і біёлагі — сэканомленымі рэактывамі, географы—геаграфічнымі картамі і дапаможнікамі. Больш 600 лекцый прачытана студэнтамі у гэтым навучальным годзе.

Умацоуваюцца сувязі з прамысловымі прадпрыемствамі. Камітэт камсамола універсітэта нядауна заключыу дагавор аб супрацоуніцтве з камсамольскай арганізацыяй Мінскага камвольнага камбіната. Становяцца больш цеснымі кантакты матэматычнага факультэта з камсамольцамі маторнага завода. Імкненне студэнтау быць бліжэй да рабочага класа, сялянства—вось важны вынік гадавой работы па Ленінскаму заліку.

У гэтым навучальным годзе актывізаваліся і мацнелі сувязі нашых камсамольцау з воінамі ЧБВА, з музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, з Акруговым домам афіцэрау. Больш цеснымі сталі сувязі камсамольскай арганізацыі БДУ з зямляцтвамі замежных студэнтау, прадстаунікамі 21 краіны, якія вучацца у нашым універсітэце. Асабліва добрыя адносіны устанавіліся паміж камітэтам камсамола і камітэтам Саюза Працоунай Моладзі Хо Шы Міна універсітэта. Нядауна быу прадоужаны дагавор аб супрацоуніцтве паміж нашымі арганізацыямі.

Задачы, якія стаяць перад камсамольцамі універсітэта у дні святкавання 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна,—вялікія і адказныя. Для таго, каб паспяхова іх вырашыць, студэнты павінны быць не толькі культурнымі і адукаванымі, але і згуртаванымі, дысцыплінаванымі, носьбітамі высокіх ідэалау і маральных якасцей будаунікоу камунізма, страснымі барацьбітамі супраць буржуазнай ідэалогіі і маралі.

Ужо цяпер мы акрэсліваем далейшыя перспектывы Ленінскага заліку. Трэба захаваць прынцып атэстацыі кожнага камсамольца, сістэматычна паэтапна кантраляваць выкананне асабістых і калектыуных абавязацельствау, прынятых камсамольцамі. Такі падыход дазволіць нам пераадолець усе тыя недахопы, якія яшчэ ёсць у рабоце камсамольскай арганізацыі універсітэта.

**В. ПРАКОШЫН,**
сакратар камітэта камсамола БДУ.

## ГАВОРАЦЬ ЛЕНІНСКІЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

**АНАТОЛЬ МІНЬКО, студэнт IV курса фізічнага факультэта:**

— Усё добрае, светлае у нашым жыцці непарыуна звязана з імем Леніна. Жывэм па запаветах Ільіча, вучымся па яго кніжках. Мне радасна, што ленінскім стыпендыятам я стау у гэты знамянальны год. Усведамленне законнай радасці і гонару мяне ахоплівае разам з пачуццём вялікай адказнасці. Калі вучыцца — то добрасумленна, калі працаваць — то з поунай нагрузкай, калі быць таварышам, сябрам — то прынцыповым, уважлівым, шчырым. І сябры ведаюць: патрэбна — дапамагу, растлумачу і спытаю у іх за даручаную справу без скідак і мяккацелай памяркоунасці. Таму, напэуна, і выбралі мяне намеснікам сакратара камітэта камсамола нашага факультэта.

*НАТАША КАЛЕСНІКАВА, студэнтка IV курса біялагічнага факультэта:*

**— Выдатную вучобу не хачу ставіць за асаблівую заслугу студэнта. Гэта наш доуг і абавязак перад Ільічом. Кожную сесію больш паловы нашай групы здае на выдатна. Грыша Доубік, Ларыса Нікольская, Міла Казлова — студэнты, якія умеюць працаваць па-сапрауднаму. Я сярод іх, здаецца, нічым не выдзяляюся.**

**З дзяцінства я вельмі люблю жывёл. А у школе захаплялася хіміяй. Зараз мае захапленні шчасліва увасабляюцца у будучай прафесіі біяхіміка. Хачу даведацца як мага больш, прачытаць не толькі праграмную літаратуру, але і дадатковую. Калі б выпала магчымасць зноу выбіраць факультэт, я б несумненна назвала біяфак.**

**Студэнт не павінен цалкам аддаваць сябе толькі заняткам, лекцыям і кнігам. Паважаю тых, хто умее спалучаць вучобу з працай, грамадскай дзейнасцю і адпачынкам. Сама я з'яуляюся членам камітэта камсамола кафедры біяхіміі і біяфізікі, іграю на баяне у аркестры народных інструментау універсітэта, дапамагаю актывістам насценнага друку. А яшчэ я з захапленнем чытаю мастацкія кнігі, гляджу новыя фільмы. На усё хапае часу.**

**МІХАІЛ ВАЛЬЧЫК, студэнт IV курса геолага-геаграфічнага факультэта:**

*— Зместам свайго жыцця лічу паусядзённую карпатлівую працу. Кожны дзень стараюся насыціць карыснымі справамі.*

*Будучая спецыяльнасць географа да многага мяне абавязвае. Хочацца многае ведаць. Цікава дазнацца не толькі, дзе жывуць людзі, але як жывуць, чым займаюцца, іх эканамічны і палітычны уклад, іх мова, традыцыі, звычкі. І калі ж, як не цяпер, у залатую пару студэнцтва, мы можам нагаліць сваю прагу да ведау.*

*Як і многія іншыя, ніколі не адмауляюся ад грамадскай работы. Яна дапамагае у вучобе, прывучае вырашаць многія складаныя пытанні самастойна. З першага курса я з'яуляюся старастай групы, а зараз і старшынёй студэнцкага навуковага таварыства.*

*Быць ленінскім стыпендыятам нялёгка. Не толькі перад выкладчыкамі у час сесій, але і перад таварышамі трэба апраудаць гэтае пачэснае званне.*

## НІ ДНЯ БЕЗ ПОШУКУ



**Сашу Верашчагіна я сустрэу у хімічнай лабараторыі. Запомнілася яго усмешка, прыветная, шчырая. Пагутарыць нам тады не удалося: ён спяшауся на прадпрыемства, па заказу якога выконвау гаспадарча-дагаворную работу. Але шмат цікавага мне расказалі дзяучаты-дыпломніцы. Яны лічаць Сашу сваім «выратавальнікам» у хімічных доследах, дарадчыкам, вельмі карысным памочнікам у працы над дыпломнымі. Мяне гэта уразіла: Верашчагін толькі на трэцім курсе. Чым жа ён дапаможа пяцікурсніцам Марыі Храпко, Тамары Канстанцінавай, Лене Сушко?**

**— Саша ведае хімію лепш за кожную з нас,—расказвае Лена.—Аднойчы у час рэакцыі адбыуся выбух. Я не ведала, у чым прычына. Падышоу Саша—і усё адразу ж вытлумачыу.**

**— Калі ён вучыуся яшчэ на першым курсе,—кажа Тамара,—на нашым слухау спецкурс. І у лабараторыю прыйшоу яшчэ першакурснікам, ведае тут усё да драбніц. А ці возьмуць цябе у лабараторыю, ды яшчэ з першага,—вырашае тваё уменне хутка рашаць складаныя задачы і, безумоуна, тваё жаданне працаваць многа, настойліва, часта ахвяруючы вольным часам.**

**У гэтай лабараторыі Саша заседжваецца часам да адзінаццаці гадзін вечара.**

**Навуковая праца, пошук—гэта жыццё Сашы Верашчагіна.**

**У наступным годзе у часопісе АН СССР «Неарганічныя матэрыялы» будзе апублікавана калектыуная праца «Аб некаторых уласцівасцях цвёрдых растворау на аснове двухвокісу цырконію», якая напісана загадчыкам кафедры неарганічнай хіміі В. В. Свірыдавым, дацэнтам Г. І. Васільевай і ім, Сашай Верашчагіным, студэнтам трэцяга курса.**

**Тры гады займаецца Саша праблемай каталізу, якая, на яго думку, будзе яшчэ доуга заставацца нявырашанай.**

**І наогул, Сашу вабяць тэмы маладаследаваныя, спрэчныя. Праца над імі—гэта творчы пошук, які патрабуе настойлівасці і глыбокіх ведау, а у выніку прыносіць радасць.**

**Нядауна са сваім новым дакладам «Аб некаторых філасофскіх праблемах хімічнай сувязі» С. Верашчагін выступіу на універсітэцкай навуковай хімічнай канферэнцыі. Цяпер ён рыхтуецца выступіць на канферэнцыі рэспублік Прыбалтыкі і Беларусі у Таліне з дакладам аб структурных пераутварэннях некаторых асноу металау.**

**У Сашы многа грамадскіх даручэнняу. Зараз ён дапамагае у працы над дакладам студэнту II курса Юры Орліку.**

**— Наурад ці можна было б даручыць каму-небудзь са студэнтау кіраваць навуковай работай студэнта, — гаворыць В. В. Свірыдау.—Але я веру, што Саша Верашчагін здолее зрабіць гэта, і не горш за мяне.**

**— Сашу можна даручыць любую справу,—зауважае інжынер лабараторыі Галіна Міцуль,—і ён выканае яе як удумлівы інжынер.**

**— Захацелася шукаць нязведанае яшчэ у школе,—успамінае Саша. — Першая маленькая мая перамога была тады, калі я даказау настаунікцы хіміі, што поліэтылен рэагуе з азотнай кіслатой, хоць у падручніку сцвярджалася адваротнае. Першы поспех акрыліу і натхніу мяне.**

**Потым былі і большыя перамогі: дыпломы на абласных і рэспубліканскіх хімічных алімпіядах, сярэбраны медаль пасля заканчэння сярэдняй школы.**

**Нядауна у жыццё Сашы Верашчагіна прыйшоу радасны і вялікі дзень: яго прынялі кандыдатам у члены ленінскай партыі.**

**П. ГЕЙДЗІЧ,**
**студэнт III курса факультэта журналістыкі.**

## У ШАРЭНЗЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

Напярэдадні юбілейных урачыстасцей ва універсітэце падведзены вынікі грамадскага агляду па культуры вытворчасці і ахове працы. Вызначаны лепшыя факультэт, кафедра, лабараторыя, аддзел адміністрацыйна-гаспадарчай часткі і акадэмічная студэнцкая група. На урачыстым сходзе пераможцам уручаны узнагароды.

Калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў геолага-геаграфічнага факультэта, заняўшы у аглядзе першае месца, атрымау Пераходны чырвоны сцяг, Ганаровую грамату універсітэта, ён узнагароджан і бясплатнай паездкай па ленінскіх месцах. Ганаровымі граматамі і вымпеламі ўзнагароджаны калектывы выкладчыкаў і супрацоўнікаў гістарычнага і юрыдычнага факультэтау, заняўшыя адпаведна другое і трэцяе месцы. Пераможца грамадскага агляду па культуры вытворчасці сярод агульнауніверсітэцкіх кафедр калектыў кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў (загадчык кафедры прафесар У. М. Сікорскі) атрымау Ганаровую грамату, вымпел і памятны падарунак.

Ганаровымі граматамі універсітэта і вымпеламі ўзнагароджаны лепшыя кафедры універсітэта: фізічнай геаграфіі замежных краін, гісторыі БССР, дыферэнцыяльных ураўненняў, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, рускай мовы падрыхтоўчага факультэта і інш., пераможцы агляду з выдавецтва, друкарні, вылічальнага цэнтра і ваеннай кафедры, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі і вучэбнай гаспадаркі, лепшыя акадэмічныя групы факультэтаў.

Выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта, якія выканалі ўсе ўмовы грамадскага агляду, узнагароджаны Ганаровымі граматамі універсітэта і памятнымі падарункамі, аб'яўлены падзякі лепшым студэнтам.

# ЛЕНІН І УНІВЕРСІТЭТ

Гісторыя нашага універсітэта, які носіць імя У. І. Леніна, раскрывае бязмежную любоў выкладчыкаў і студэнтаў да вялікага правадыра, іх вернасць ленінскім запаветам.

11 ліпеня 1921 г. урачысты сход, прысвечаны адкрыццю універсітэта, першыя словы сардэчнай удзячнасці і гарачага прывітання адрасаваў У. І. Леніну. Пад бурныя апладысменты усёй залы адзінадушна быў прыняты тэкст пасланай яму тэлеграмы:

*«Паўстанне рабочых і сялян у дні Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі пралетарыят Расіі, кіруемы Камуністычнай партыяй і Вамі, як яе правадыром, узяў у свае рукі ўладу, дапамагло працоўнай Беларусі вызваліцца ад векавога эканамічнага і духоўнага прыгнёту і працоўным знайсці сваю радзіму — Савецкую Беларусь.*

*Адкрываючы ў дзень гадавіны вызвалення Мінска—цэнтра Беларусі—з-пад улады польскіх акупантаў Беларускі дзяржаўны універсітэт, урачысты сход, прысвечаны яго адкрыццю, ад імя партыйных, рабочых, культурных і грамадскіх сіл краю шле Вам, дарагі правадыр, свае гарачае прывітанне».*

У дзяржаўным архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР захоўваецца тэкст тэлеграмы, пасланай У. І. Леніну ў дзень першай гадавіны нашага універсітэта:

*«Масква. Крэмль. Леніну.*

*Прафесура і студэнцтва Белдзяржуніверсітэта, сабраўшыся сумесна з прадстаўнікамі савецкіх, прафесіянальных, партыйных, грамадскіх арганізацый на урачысты акт з выпадку першай гадавіны існавання свайго універсітэта, шлюць Вам, правадыру рабоча-сялянскай Савецкай Федэрацыі, гарачае прывітанне і шчырыя пажаданні далейшай плённай працы на карысць усёй рэспублікі. Універсітэт, знаходзячыся на крайняй заходняй граніцы федэрацыі, выканае ўскладзеную на яго культурную і палітычную місіі».*

Першыя экземпляры сваіх навуковых прац і іншых друкаваных выданняў прафесары і выкладчыкі нашага універсітэта з любоўю і удзячнасцю пасылалі У. І. Леніну. У асабістай бібліятэцы У. І. Леніна у Крамлі захоўваюцца «Працы БДУ» № 1 з надпісам на тытульным лісце: «Уладзіміру Ільічу ад Беларускага дзяржаўнага універсітэта», «Працы БДУ» № 2—3 з надпісам «У. І. Леніну ад БДУ», кніга, складзеная намеснікам рэктара прафесарам С. З. Кацэнбогеным, «Беларускі дзяржаўны універсітэт за 1921—22 акад. год» з надпісам «Уладзіміру Ільічу Леніну ад Беларускага дзяржаўнага універсітэта». Там жа захоўваюцца кнігі прафесара С. Я. Вальфсона «Дыялектычны матэрыялізм (курс лекцый, чытаны на факультэце грамадскіх навук БДУ)», прафесара У. І. Пічэты—«Уводзіны ў рускую гісторыю», прафесара М. М. Нікольскага — «Рэлігія як прадмет навукі», а кніга прафесара С. Я. Вальфсона «Вялікі сацыяліст. Кароткі нарыс жыцця Г. В. Пляханава» захоўваецца ў кабінеце У. І. Леніна, дзе яна і знаходзілася.

Варта адзначыць, што У. І. Ленін, праглядаючы вялікую колькасць кніг, пакідаў у асабістай бібліятэцы толькі найбольш важныя з іх.

У час хваробы У. І. Леніна лячылі лепшыя савецкія і замежныя ўрачы. Сярод іх быў і відны савецкі неўрапатолаг, адзін з арганізатараў нашага універсітэта, дэкан медыцынскага факультэта прафесар М. Б. Кроль (на здымку ўверсе справа).

У смутныя судзеньскія дні 1924 г. працоўныя нашай краіны на жалобных сходах давалі клятву быць вернымі вялікай справе Леніна, справе Камуністычнай партыі і выканаць усе ленінскія запаветы.

24 студзеня 1924 г. у газеце «Савецкая Беларусь» было апублікавана наступнае паведамленне: **«БДУ — універсітэт імя Леніна.** На агульным сходзе студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта пастаноўлена прасіць Нар. Кам. Асветы і ЦВК Беларусі аб перайменаванні БДУ ва універсітэт імя У. І. Леніна».

Як вядома, імя Уладзіміра Ільіча Леніна афіцыйна было прысвоена Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту пастановай Савета Міністраў СССР 31 снежня 1948 г.—да 30-годдзя Савецкай Беларусі. Але той факт, што у жалобныя дні 1924 г. выкладчыкі і студэнты звярнуліся да ўрада рэспублікі з просьбай прысвоіць універсітэту імя У. І. Леніна, сведчыць, што гэта дарагое імя яны заўсёды насілі у сваіх сэрцах. Наша бязмежная любоў да Леніна, вернасць справе Леніна—вечныя.

**Е. АБЕЦЭДАРСКАЯ.**

## БДУ Універсітэт імя Леніна.

**На агульным сходзе студэнтаў Беларускага Дзяржаўнага Універсітэту пастаноулена прасіць Нар. Кам. Асьветы і ЦВК Беларусі аб пераіменаваньні БДУ ва Універсітэт імя Леніна.**




Владимиру Ильичу Ленину от Белорусского Государств. Университета

Социалистическая Советская Республика Белоруссия.

Белорусский Государственный Университет

за 1921—22 акад. год

Государственное Издательство Белоруссии.

МИНСК 192_ г.


МОСКВА

КРЕМЛЬ

ЛЕНИНУ

ПРОФЕССУРА И СТУДЕНЧЕСТВО БЕЛГОСУНИВЕРСИТЕТА СОБРАВШИСЬ СОВМЕСТНО С СОВЕТСКИМИ ПРОФЕССИОНАЛЬНЫМИ ПАРТИЙНЫМИ ОБЩЕСТВЕННЫМИ ОРГАНИЗАЦИЯМИ НА ТОРЖЕСТВЕННЫЙ АКТ ПО СЛУЧАЮ ПЕРВОЙ ГОДОВЩИНЫ СУЩЕСТВОВАНИЯ СВОЕГО УНИВЕРСИТЕТА ШЛЮТ ВАМ ВОЖДЮ РАБОЧЕКРЕСТЬЯНСКОЙ СОВЕТСКОЙ ФЕДЕРАЦИИ ГОРЯЧИЙ ПРИВЕТ И ИСКРЕННИЕ ПОЖЕЛАНИЯ ДАЛЬНЕЙШЕЙ ПЛОДОТВОРНОЙ РАБОТЫ НА БЛАГО ВСЕЙ РЕСПУБЛИКИ. УНИВЕРСИТЕТ НАХОДЯСЬ НА КРАЙНЕЙ ЗАПАДНОЙ ГРАНИ ФЕДЕРАЦИИ ВЫПОЛНИТ ВОЗЛОЖЕННУЮ НА НЕГО КУЛЬТУРНУЮ И ПОЛИТИЧЕСКУЮ МИССИИ

# СВЯТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

Пачатак работы быў абвешчаны на 10 гадзін раніцы. Людзі прыйшлі раней. Ля вучэбных карпусоў, ля інтэрнатаў тоўпілася гаманлівая моладзь з рыдлёўкамі, вёдрамі і граблямі ў руках. Не цярпелася хутчэй распачаць работу.

Цёпла і сардэчна прымалі нашых студэнтаў на заводзе «Транзістар». На дапамогу рабочым прыйшлі першакурснікі фізічнага факультэта.

На авіярамонтным заводзе працавалі матэматыкі і хімікі. Рабочыя ў знак удзячнасці за шчырасць і стараннне паказалі студэнтам пасля работы свой завод. У былым хімкорпусе завіхаліся журналісты. Тут яны хутка будуць займацца, таму і працаваў кожны з пачуццём адказнасці, добрасумленна. Асабліва вызначыліся Пётр Шыцік, Міхаіл Шульман, Тамара Вашчанка і іншыя. Паваеннаму чотка і зладжана кіраваў работай намеснік дэкана Міхаіл Іванавіч Сілуянаў.

Разам з моладдзю працавалі выкладчыкі, сівыя прафесары. Мылі вокны, прыбіралі памяшканні ці ачышчалі двары, выносілі будаўнічыя адходы і смецце—усё рабілася ахвотна, са святочным настроем. На камуністычныя суботнікі 12 і 19 красавіка выйшлі 11.162 чалавекі з універсітэта. Побач з нашымі студэнтамі плячо ў плячо працавалі і студэнты з-за рубяжа.

Так народжаны больш як паўвека назад патрыятычны пачын маскоўскіх рабочых, які У. І. Ленін назваў вялікім пачынам, ператвараўся зараз ва ўсенароднае свята камуністычнай працы.

**Л. ПЕТЭРСОН.**



# ПЕРАМОЖНАЕ ШЭСЦЕ ІДЭЙ

100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна — велічная дата ў гісторыі чалавецтва. У розных кутках свету ленінізм прыцягвае мільёны людзей. Усё больш і больш ідэі Леніна пранікаюць і ў жыццё Афрыкі. Аб гэтым гавораць шматлікія факты.

**Нігерыя.** Першы з'езд сацыялістычнай рабоча-сялянскай партыі прыняў рашэнне заснаваць Ленінскую бібліятэку.

**Маўрытанія.** Прадстаўнікі маладых рэвалюцыянераў вострава пастанавілі: стварыць саюз і назваць яго Ленінскай арганізацыяй моладзі.

**Занзібар.** Бальніца, якая раней абслугоўвала султана і яго прыбліжаных, стала народнай лячэбнай установай. Яна названа «Шпіталь імя У. І. Леніна». Шмат дактароў гэтага шпіталя атрымалі адукацыю ў медыцынскіх інстытутах Савецкага Саюза.

**Малі.** Вялікім попытам карыстаюцца ў рэспубліцы працы У. І. Леніна. Менавіта ў першакрыніцах класікаў марксізма-ленінізма шукаюць зараз малійскія чытачы, асабліва моладзь, адказы на хвалюючыя маладую рэспубліку пытанні. Выстаўка фатаграфій і кніг, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, адкрылася ў сакавіку ў Сегу — адным з буйнейшых гарадоў рэспублікі.

**Сенегал.** З выпадку 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна адбыліся вечары сенегальскай грамадскасці. У Дакары удзельнікі вечара з вялікай цікавасцю прагледзелі фільмы «Жывы Ленін» і «Жалезны паток».

**Алжыр.** У Аннебе — буйным прамысловым цэнтры краіны прайшла нядзеля савецкага фільма, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. У фае кінатэатра «Мажэсцік» адкрылася выстаўка, якая расказвае аб жыцці і дзейнасці У. І. Леніна.

Выстаўка савецкай кнігі адкрылася ў муніцыпальнай бібліятэцы горада Алжыра. На ёй былі прадстаўлены Поўны збор твораў Леніна, мастацкая, навуковая і тэхнічная літаратура, кнігі для дзяцей. Усе гэтыя кнігі — больш 500 назваў, выдадзеныя на арабскай і французскай мовах, — перададзены савецкім пасольствам у дар муніцыпальнай бібліятэцы.

**Аб'яднаная Арабская Рэспубліка.** У Александрыі адбыўся сімпозіум «Ленін і нацыянальна-вызваленчы рух».

**Конга (Браззавіль).** Адна з ячэек партыі «Нацыянальны рэвалюцыйны рух» (1969 г.) па просьбе яе членаў названа Ленінскай.

Падборку зрабіў
**Роберт Кейге,**
студэнт 5 курса біяфака.

Рэдактар **А. А. НІКОЛЕНКА.**

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т 22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. АТ 02188 Зак. 545.